Вобраз Лесуна сустракаецца ў вераваннях розных еўрапейскіх народаў. Блізкім па сваім змесце да гэтай уяўнай істоты з'яўляецца эльф — прыродны дух. У скандынаўскай міфалогіі гаспадарамі лесу з'яўляюцца менавіта яны, эльфы (па-дацку — elv, па-шведску — älv, па-нарвежску — alv, па-ісландску — àlf-ur). Як сцвярджае рускі пісьменнік А. К. Булыгін, «эльфы жывуць побач з людзьмі: на гары, у лесе, у дрэве (дрэва ў такім выпадку нельга секчы), водзяць ноччу карагоды, заваблiваюць да сябе падарожнікаў, часам зводзяць юнакоў ці дзяўчат» [4, с. 1]. Яны, аднак, могуць быць прычынай раптоўнай хваробы або вар'яцтва людзей. Ёсць эльфы светлыя і цёмныя. Светлыя эльфы (або альвы) у скандынаўскіх міфах — духі прыроды (першапачаткова душы памерлых людзей), па сваіх функцыях блізкія да ванаў — багоў урадлівасці і марской стыхіі. Свет эльфаў называюць «краінай вечнага юнацтва», таму што час тут цячэ па-іншаму, не так, як у людзей. Напрыклад, у шатландскай казцы «Два скрыпачы са Стратспі» музыкі, якія гулялі на балі ў эльфаў адну ноч, вяртаюцца ў свой горад праз сто гадоў.

**Заключэнне.** З'яўленне вобразаў духаў-гаспадароў звязана з язычніцтвам, якое патрабавала шанавання нябачных існасцей, асцярогі ў адносінах да іх з боку чалавека. Суіснаванне духаў-гаспадароў і людзей выяўляе гарманічныя адносіны чалавека да прыроды. З прыняццем хрысціянства духі-гаспадары атрымліваюць выразна негатыўны сэнс. Лясны Цар, Лесавік — дух лесу, які валодае багаццямі і мае раскошныя лясныя харомы. Па сваім змесце блізкім да гэтага вобраза з'яўляецца, напрыклад, скандынаўскі эльф. Вобраз Ляснога Цара, Лесавіка — надзвычай каларытны, у міфалогіі ён мае даволі дэталёвае апісанне. Вобраз Лесавіка звязаны не толькі з вераваннямі славян, беларусаў, іншых еўрапейскіх народаў. Ён стаў крыніцай для стварэння адпаведных вобразаў у мастацкай літаратуры.

#### Спіс цытаваных крыніц


1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БэлЭн, 2005. — Т. 1 : Акапэла — Куцця. — 768 с.
2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2006. — Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва — «Яшчур». — 832 с.
3. Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. — Мінск : Беларусь, 2006. — 599 с.
4. *Булыгін, А. К.* Хто такі Лясны Цар? [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.liveinternet.ru/users/4538230/post305029881 . — Дата доступу: 26.03.2020.



УДК 372.882



**Т. Л. Харытонава**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ляснянская сярэдняя школа» Баранавіцкага раёна*


## МАГЧЫМАСЦІ КРАЯЗНАЎЧАГА МАТЭРЫЯЛУ ПРЫ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Уводзіны.** Вучэбная праграма па прадмеце «Беларуская літаратура» ў сярэдняй школе накіроўвае працу настаўніка на наладжванне адукацыйнага працэсу такім чынам, каб вучні авалодвалі вопытам літаратурна-творчай дзейнасці, развівалі творчыя схільнасці праз далучэнне да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа.

Арганізацыя навукова-даследчай работы па літаратуры ў школе ўяўляе сабой складаны працэс, звязаны з такімі праблемамі, як выяўленне творчых, філалагічна адораных вучняў, у якіх ёсць цікавасць і жаданне займацца даследаваннем; падрыхтаванасць да гэтай работы настаўніка, які валодае методыкай арганізацыі і напісання навуковых прац; разуменне спецыфікі літаратурнага даследавання, арыентаванага на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкасць; узровень маўленчай культуры вучняў, здольных на самавыражэнне на беларускай мове, асабліва ў рускамоўных школах.

Адным з дзейсных сродкаў павышэння матывацыі да заняцця вучнямі навукова-даследчай працай па літаратуры з'яўляецца зварот да краязнаўчага матэрыялу.

**Асноўная частка.** Пад *літаратурным краязнаўствам* трэба разумець вучэбна-выхаваўчую работу, у ходзе якой вывучаюцца літаратурныя факты, з'явы, падзеі, звязаныя з той мясцовасцю, дзе знаходзіцца школа. «Агульнапрынятым стала палажэнне, што, каб зразумець пісьменніка, трэба пабываць на яго радзіме. Творчасць мастака нельга разглядаць у адрыве ад таго асяроддзя, дзе ён нарадзіўся і жыў, бо яно накладвае пэўны адбітак на яго светаўспрыманне, узбагачае жыццёвым вопытам і з'яўляецца патэнцыяльным матэрыялам для будучых твораў. Большасць пісьменнікаў у сваёй творчасці ідзе ад асабіста перажытага» [2, с. 22].

Змест і методыка літаратурна-краязнаўчай працы павінны суадносіцца з асаблівасцямі ўзроставай эвалюцыі юнага даследчыка. Асноўныя формы працы павінны садзейнічаць літаратурнаму развіццю асобы вучня, захоўваць сістэматычнасць і пераемнасць гэтай працы ў розных узроставых групах. Гэта неабходна


© Харытонава Т. Л., 2020

ўлічваць настаўніку, каб дасягнуць поспехаў у літаратурна-краязнаўчай даследчай працы. Звяртаючыся да краязнаўчага матэрыялу, неабходна ведаць, якія метады і прыёмы могуць даць найбольшы эфект для развіцця творчай асобы вучня.

Арганізацыя навукова-даследчай работы па беларускай літаратуры ў 5—6 класах носіць яшчэ падрыхтоўчы характар, яна падпарадкавана галоўнай задачы гэтага этапу літаратурнага развіцця вучня — абуджэнню цікавасці да чытання, да беларускай кнігі і роднага слова. У гэты перыяд неабходнай умовай развіцця чытацкага ўяўлення з’яўляецца ўзбагачэнне кола жыццёвых уражанняў навучэнцаў. Чым большы жыццёвы, эмацыянальны і інтэлектуальны вопыт чытача, фонд яго жыццёвых уражанняў, тым больш магчымасцей узнікнення асацыяцый пры чытанні. Таму ў гэты перыяд карыснымі будуць *сустрэчы і экскурсіі, збіранне фальклору*. Можна праводзіць сустрэчы з песеннікамі, казачнікамі, з людзьмі, якія ведалі пісьменніка ці былі сведкамі гістарычнага мінулага. Для вучняў 5—6 класаў можна правесці сустрэчу з непасрэднымі выканаўцамі фальклорных твораў, даць магчымасць паслухаць аповед старажылаў пра абрады, звычаі, прыкметы, павер’і і г. д. Пры гэтым звярнуць увагу школьнікаў на асаблівасці мясцовай гаворкі. У якасці дамашняга задання прапанаваць падрыхтаваць вусную замалёўку пра свята Каляды (6 клас). Гэтыя прыёмы дазволяць вучням па-новаму паглядзець на творы вуснай народнай творчасці, падтрымаюць цікавасць навучэнцаў да пошуку і адкрыццяў.

Вопыт паказвае, што самастойнае даследаванне па пэўнай тэме выклікае глыбокую цікавасць вучняў і жаданне працаваць. Так, пры вывучэнні ў 6 класе тэмы «Уладзімір Ліпскі. Ад роду — да народу» вучні атрымліваюць заданне паспрабаваць скласці радаводнае дрэва, у выніку чаго самастойна вывучаюць гісторыю свайго роду, лёс сваіх продкаў.

Дапамагаюць падрыхтавацца да ўспрымання твора, літаратурнага пейзажа экскурсіі ў прыроду.

Для падлеткавага перыяду (7—8 класы) характэрна імкненне да самастойнасці. З’яўляецца неабходнасць у самасцвярджэнні, павышаецца актыўнасць, схільнасць да дзейнасці. Для гэтага перыяду характэрна цяга да літаратурнай творчасці, літаратурна-краязнаўчая праца спрыяе развіццю літаратурна-творчых здольнасцей вучняў. У гэты перыяд можна пачынаць займацца з вучнямі *даследчай дзейнасцю*.

У 8 класе пры разглядзе тэмы «Народныя песні. “Бяроза з лістом…”, “Зеленеюць, зелянеюць лугі, сенажаці…» можна звярнуць вучняў да даследчай дзейнасці, прапанаваць запісаць ад старажылаў, сваякоў ці суседзяў народную песню, пры гэтым зрабіць яе поўную пашпартызацыю.

9 клас. Для гэтага перыяду характэрны асабістасць, суб’ектывізм. Аўтарскія думкі і пачуцці высвятляюцца на другі план асабістымі хваляваннямі. Для вучняў гэтага ўзросту найбольш блізкімі з’яўляюцца маральныя праблемы. Важна выкарыстоўваць усё, што дапаможа ўмацаванню цікавасці да асобы аўтара, аўтарскай задуме і яе мастацкаму ўвасабленню, працэсу ўзнікнення твора. Выкарыстоўваюцца супастаўленні рэальнага жыцця з яго мастацкім асэнсаваннем. Праз успаміны старых людзей аналізуюцца падзеі, апісаныя ў творы, прататыпы літаратурных герояў параўноўваюцца з іх мастацкім увасабленнем. Гэты перыяд з’яўляецца спрыяльным для *літаратурна-творчых прац*.

У 10—11 класах адбываецца актыўнае станаўленне асобы, фарміруецца светапогляд, ідэал чалавека. Вучні не проста пазнаюць наваколле, а выпрацоўваюць свой пункт погляду. Ва ўспрыманні мастацкай літаратуры павышаецца цікавасць не толькі да маральнага, але і да філалагічнага аспекту праблемы, што дазваляе разглядаць твор як адно мастацкае цэлае. Літаратурнае краязнаўства дапамагае раскрыць умовы, якія аказалі ўплыў на фарміраванне асобы пісьменніка і мелі адбітак у яго творчасці, зразумець складанасць і шматграннасць гісторыка-літаратурнага працэсу.

Матэрыял, сабраны ў працэсе літаратурна-краязнаўчых заняткаў, можа сістэматызавацца і абагульняцца праз *напісанне творчай працы*: нарыса пра выдатнага земляка, партрэта вядомага аднавяскоўца, замалёўкі прыроды, нататкі пра гісторыю роднай школы, вуліцы, вескі, артыкула пра мінулае і сучаснае роднага краю.

Пошукавую і даследчую дзейнасць па краязнаўству немагчыма абмежаваць толькі рамкамі ўрока. Больш поўнае ўяўленне пра літаратуру роднага краю можна даць праз факультатыўныя заняткі і арганізацыю пазакласнай працы. Тым больш, што асобныя гадзіны на вывучэнне жыцця і творчасці пісьменніка-земляка ў школьнай праграме не выдзяляюцца.

«Даследчая работа выконваецца, як правіла, на заключнай ступені літаратурнага навучання, яе падрыхтоўка вымагае авалодання тэхналогіяй навуковага даследавання, умення структуравання зместу, кампаноўкі тэксту» [3, с. 5].

На станцыі Лясная Баранавіцкага раёна ў 1882 годзе нарадзіўся прадстаўнік беларускага Адраджэння Уладзіслаў Галубок. Акцёр і рэжысёр, жывапісец і пісьменнік, грамадскі дзеяч і арганізатар тэатра, унук паўстанца, які змагаўся пад Мілавідамі. Спадчына гэтай шматграннай асобы мае шырокі прастор для даследаванняў.

Падрыхтоўчы эмацыянальны этап даследавання творчасці Уладзіслава Галубка абумоўлены веданнем школьнікамі пра гэтага пісьменніка з дзіцячага ўзросту. У аграгарадку Лясная Баранавіцкага раёна 26 жніўня 1990 года быў адкрыты памятны знак з шыльдай. На ёй надпіс: *«Уладзіславу Галубку, выдатнаму грамадскаму дзеячу, драматургу, паэту, актору, мастаку ад удзячных нашчадкаў»*. У ДУА «Ляснянская сярэдняя школа» Баранавіцкага раёна аформлена музейная экспазіцыя, прысвечаная пісьменніку-земляку.

Звярнуўшыся да творчасці пісьменніка, важна вызначыць аб'ект даследавання, абмежаваць яго межы, бо творчая спадчына Уладзіслава Галубка даволі вялікая. У беларускім літаратуразнаўстве сярод даследаванняў яго творчасці пераважаюць працы, прысвечаныя драматургіі. І гэта заканамерна, бо У. Галубок з'яўляецца пачынальнікам прафесійнага тэатру на Беларусі, па аб'ёме ў яго спадчыне пераважаюць п'есы. Таму ў вучнёўскім даследаванні было вырашана звярнуцца да апавяданняў пісьменніка.

Пры выбары і фармуляванні тэмы была звернута ўвага на тое, што Уладзіслаў Галубок прыйшоў у беларускую літаратуру ў пачатку ХХ стагоддзя, а для развіцця літаратуры ў перыяд яе станаўлення вялікае значэнне мае фальклор. «У працэсе паскоранага развіцця беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя ўнікальную ролю выканалі класікі беларускай літаратуры Я. Купала, Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч, А. Гарун, З. Бядуля, М. Гарэцкі, В. Ластоўскі і інш., выхаваныя ў атмасферы беларускіх песень, казак, паданняў, абрадаў, прымавак, загадак» [1, с. 663]. Таму тэма даследавання была сфармулявана наступным чынам: «Фальклорныя традыцыі ў прозе Уладзіслава Галубка». Прадметам даследавання сталі фальклорныя вобразы, матывы, паэтычныя сродкі, знойдзеныя ў апавяданнях пісьменніка ў працэсе іх літаратуразнаўчага аналізу.

Была пастаўлена мэта: даследуючы малую прозу Уладзіслава Галубка, прасачыць яе сувязь з традыцыямі беларускага фальклору. Метадам даследавання стаў параўнальны (супастаўляльны) аналіз мастацкага твора з фальклорнымі адзінкамі.

У выніку гэтага даследавання праз адметнасць асваення фальклорнага матэрыялу ў апавяданнях была паказана самабытнасць творчай асобы Уладзіслава Галубка. Вобразы, матывы беларускіх народных казак, легендаў, паданняў знайшлі сваё ўвасабленне ў апавяданнях пісьменніка. Мова апавяданняў насычана трапнымі народнымі выслоўямі, прыказкамі і прымаўкамі, праз якія перадаецца спрадвечная жыццёвая мудрасць усяго беларускага народа. Фальклорныя традыцыі ў апавяданнях У. Галубка з'яўляюцца ідэйназначнымі, дапамагаюць пісьменніку стварыць чалавечыя характары ў апавяданнях; праз фальклорныя вобразы-сімвалы пісьменнік узнімаецца да філасофскага асэнсавання рэчаіснасці, яго хвалююць лёс чалавека, сацыяльныя абставіны жыцця, пытанні мінулага і будучыні.

Па матэрыялах даследавання творчасці Уладзіслава Галубка вучаніца Ляснянскай сярэдняй школы Бураўка Вікторыя падрыхтавала навуковы артыкул «Фальклорныя вытокі вобраза сіраты ў апавяданнях Уладзіслава Галубка» і выступіла з ім на Міжнародным форуме моладзі «Першы крок у навуку — 2019», які праводзіўся ў снежні 2019 года ў Мінску.

**Заключэнне.** Для вучняў творчасць пісьменніка становіцца больш зразумелай, калі разглядаць яе з улікам таго асяроддзя, дзе ён нарадзіўся і жыў. На сувязь мастака з пэўным краем акрамя канкрэтных біяграфічных фактаў паказваюць факты, якія можна знайсці ў мастацкіх творах. Кожны мастацкі твор пісьменніка выкліканы да жыцця пэўным гістарычным часам, яго праблемамі і стаўленнем да іх мастака слова.

Каб напісаць навукова-даследчую работу па літаратуры, вучань сярэдняй школы павінен валодаць пэўнымі здольнасцямі і ўменнямі: пазнаваць свет і сябе, крытычна ставіцца да прачытанага; аналізаваць мастацкі тэкст і разумець вобразную мову; афармляць на пісьме навуковыя факты, здабытыя ў працэсе самастойнай даследчай дзейнасці; сістэматызаваць сабраны фактычны матэрыял і даваць яму інтэрпрэтацыю, рабіць вывады; будаваць выказванне ў навуковым стылі ў адпаведнасці з асаблівасцямі пэўных жанраў.

Усе гэтыя ўменні выпрацоўваюцца на працягу ўсёй літаратурнай адукацыі ў сярэдняй школе, дзе важны прынцыпы сістэмнасці і пераемнасці з улікам пэўных узроставых асаблівасцей вучняў.

Добрую дапамогу пры арганізацыі навукова-даследчай работы па беларускай літаратуры аказвае краязнаўчы матэрыял. «У працах вучняў, напісаных на краязнаўчым матэрыяле, як правіла, менш кніжнага, надуманага, чым у творчых працах іншых відаў, бо ў гэтых выпадках вучні ідуць ад таго, што асабіста ведаюць» [2, с. 22]. Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу пры вывучэнні беларускай літаратуры спрыяе актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : Беларус. Энцыкл., 2006. — Т. 2. — 832 с.
2. *Ляшук, В. Я.* Літаратурнае краязнаўства ў школе / В. Я. Ляшук. — Мінск : Выш. шк., 1991. 150 с.
3. *Пучынская, Т. М.* Методыка правядзення навукова-даследчай працы па беларускай літаратуры / Т. М. Пучынская // Беларус. мова і літ. — 2019. — № 1. — С. 3—7.